■ Бягун вакол свету

ПЕРШАЯ. ЖАНОЧАЯ. НАША

Сям'я з трох цудоўных дам Кацярыны, Алісы і Элізабэт БЯГУН на гэтым тыдні адпраўляецца ў першую жаночую кругасветную вандроўку. Яшчэ не было ні аднаго зафіксаванага выпадку, калі жанчыны самастойна безупынна праехалі 40 тысяч кіламетраў, перасеклі ўсе мерыдыяны, адзначыліся на супрацьлеглых кропках Зямлі і двойчы перасеклі экватар. Менавіта такія ўмовы стаяць перад тымі, хто мяркуе апынуцца ў Клубе кругасветных вандроўцаў.



Злева направа: Элізабэт, Кацярына, Аліса Бягун.

Кацярына — маці дваіх дачок і ідэйны натхняльнік — ужо даўно планавала такую вандроўку, таму краіны абіраліся невыпадкова. Падарожніцы спачатку накіруюцца ў Расію і даедуць да Хабараўска, потым у Кітай, Тыбет, Індыю, краіны Паўднёва-Усходняй Азіі, Аўстралію, Афрыку, Антарктыду, краіны Паўднёвай і Паўночнай Амерыкі, Японію і зноў Расію. І што важна: усе пытанні з візамі яны будуць вырашаць па дарозе. Аб гэтым расказала Аліса Бягун:

— Наш шлях падчас падарожжа можа мяняцца. Дакладна едзем у Кітай, таму што ў нас ужо ёсць віза. Спачатку мы разлічвалі ехаць увогуле з чыстым пашпартам, але тады мы згубілі б некалькі дзён у Расіі, чакаючы кітайскую візу. З уездам у іншыя краіны мы будзем разбірацца па дарозе, таму, калі ўзнікнуць нейкія пытанні з дакументамі, трэба будзе мяняць маршрут. У гэтым сэнсе мы вельмі гнуткія.

Я добра ведаю англійскую, італьянскую на размоўным узроўні і цяпер вывучаю кітайскую мову. Мая сястра Ліза размаўляе на каталанскай і іспанскай (яна нам вельмі дапаможа ў Паўднёвай Амерыцы). Таму з-за моўных бар'ераў, мяркую, пытанняў быць не павінна. Яшчэ мы зрабілі прышчэпкі ад жоўтай ліхаманкі. Без іх нельга ўязджаць у некаторыя афрыканскія краіны, напрыклад Габон, і рэкамендавана іх зрабіць перад вандроўкай у Паўднёвую Амерыку. У Беларусі гэтыя прышчэпкі робяць бясплатна і выдаюць жоўты пашпарт, у якім на некалькіх мовах напісана, што яна сапраўдная на працягу дзесяці гадоў.

Першапачаткова мы хацелі адзін раз на месяц праводзіць беларускія вечарынкі, думалі, гэта стане нашай «фішкай». Хутчэй за ўсё, такіх свят менавіта ў вызначаны дзень кожнага месяца мы рабіць не будзем. Але ўсюды будзем расказваць, адкуль прыехалі, гаварыць пра нашу культуру, гісторыю. Мама неяк слушна сказала, што, на самай справе, кожны чалавек з Беларусі, які падарожнічае, гэтым займаецца, таму што многія за мяжой блытаюць нас з Расіяй, і трэба расказваць, што ў нас ёсць свая мова, культура, людзі, абсалютна не падобныя на іншых. Напэўна, у гэтым будзе наша беларуская місія.

Усе члены сям'і прызнаюцца, што такая кампанія ім вельмі даспадобы. З кім жа ехаць у такую вандроўку, калі не з самымі дарагімі людзьмі? Дарэчы, Элізабэт, малодшая сястра, можа стаць самай маладой кругасветнай вандроўніцай. Ёй нядаўна споўнілася 18 гадоў. Па сваім вопыце старэйшая сястра Аліса параіла пасля таго, як яна скончыць школу, не спяшацца. «Вельмі часта маладых людзей падганяюць, кажуць, што галоўнае паступіць на каго заўгодна. Я параіла ўзяць год на роздум. Гэта папулярна ў Вялікабрытаніі і называецца gap year, калі маладыя людзі падарожнічаюць або працуюць у розных сферах, каб зразумець, што іх сапраўды цікавіць. Я лічу, для Лізы наша вандроўка — гэта вопыт, падчас якога яна зразумее, чым яна сапраўды хоча займацца, а ўжо потым паступіць ва ўніверсітэт».

«Звязда» будзе сачыць за першай жаночай кругасветнай вандроўкай і публікаваць самыя цікавыя навіны ад дзяўчын!

Надзея АНІСОВІЧ.
anisovich@zviazda.by

Даты | Падзеі | Людзі

12 КАСТРЫЧНІКА

1492 год — экспедыцыя Хрыстафора Калумба дасягнула вострава Сан-Сальвадор (афіцыйная дата адкрыцця Амерыкі). Аб прыярытэце Калумба ў адкрыцці Амерыкі ў навуковай літаратуры і дагэтуль ідзе дыскусія. Вядома, што астравы і берагавыя вобласці паўночнай і паўночна-ўсходняй Амерыкі наведваліся нарманамі за сотні гадоў да Калумба. Не выключана, што еўрапейцы і жыхары Афрыкі выпадкова дасягалі берагоў трапічнай Амерыкі. Аднак толькі адкрыццё Калумба мела сусветна-гістарычнае значэнне, паколькі толькі пасля яго плаванняў амерыканскія землі ўвайшлі ў сферу геаграфічных уяўленняў. У гонар адкрыцця Амерыкі Калумбам, іспанцам па нацыянальнасці, 12 кастрычніка ў Каралеўстве Іспанія адзначаецца нацыянальнае свята — Дзень іспанскай нацыі, або Дзень «Іспанідад».

1931 год — асвечана статуя Хрыста Збавіцеля на ўзгорку Каркавада ў Рыа-дэ-Жанэйра. Яна лічыцца сімвалам горада і ўсёй краіны. Манумент збудавалі з жалезабетоннага матэрыялу і каменю. Вышыня статуі складае 38 метраў, вага — 1145 тон, а размах рук — трыццаць метраў. Кожны год да падножжа гэтага шэдэўра прыходзяць больш чым паўтара мільёна прыезджых турыстаў. Да вяршыні пастамента праведзена чыгунка. Эскіз помніка быў распрацаваны мастаком Карласам Освальдам. Усе дэталі скульптуры былі выраблены ў Францыі і перавозіліся ў Бразілію.

1935 год — нарадзіўся Лучана Павароці, італьянскі оперны спявак, тэнар. Адзін з самых знакамітых оперных спевакоў другой паловы XX стагоддзя. Нават яго самыя непрымірымыя крытыкі не будуць спрачацца, што яго імя назаўсёды застанецца сінонімам прыгажосці чалавечага голасу.

1971 год — 45 гадоў спаўняецца Алегу Віктаравічу Навіцкаму, касманаўту-беларусу, Герою Расійскай Федэрацыі (2014). Нарадзіўся ў горадзе Чэрвені Мінскай вобласці. Скончыў Барысаглебскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў імя В.П. Чкалава, Качынскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў і Ваенна-паветраную акадэмію імя Ю.А. Гагарына. Камандзір касмічнага карабля «Саюз ТМА-06М», палёт якога адбыўся 23 кастрычніка 2012 года — 16 сакавіка 2013 года.

Было сказана

Міхась СТРАЛЬЦОЎ, пісьменнік:
«Мудрасць — багацце людзей, якія ўжо збяднелі на цэлую маладосць».

■ Інфарм-укол

ПРА «РУКАСЦЬ» І ПАЎШАР'І

Як вы думаеце, ці можна адначасова чытаць верш і рашаць арыфметычную задачу? Можа быць, і ёсць чалавек, здольны на гэта, але ці варта так рабіць у прынцыпе, тым больш, да гэтага імкнуцца? Усё ж такі згаданыя вышэй дзеянні кантралююцца рознымі паўшар'ямі мозга. Гэта, па вялікім рахунку, тое ж самае, што адной рукой рабіць адно дзеянне, а другой — іншае, якое не падмацоўвае першае, а перашкаджае яму. Работа галаўнога мозга ад гэтага не паляпшаецца. Наадварот, у такіх выпадках паміж паўшар'ямі адбываецца «канфлікт», і пры частых паўторах ён можа прывесці да негатыўных наступстваў для псіхікі.

Урач-псіхіятр-нарколаг Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя, кандыдат медыцынскіх навук Таццяна ЦЯЦЕРКІНА тлумачыць больш падрабязна:

— Паўшар'і галаўнога мозга не функцыянуюць паасобку, а толькі ў пары, і не можа такога быць, каб адно працавала, а другое адпачывала, таму не трэба нейкім «штучным» чынам прымушаць іх да адначасовай работы... Не так даўно «Звязда» надрукавала матэрыял Я. Лычкоўскай «Правае ці левае? Дуэт», у якім аўтар разважала пра асаблівасці «лева-» і «правапаўшарных» людзей. На самай справе гэта ўяўленне памылковае. Вядома, што левая палова мозга адказвае за моўныя, «мыслісцельныя» функцыі, правая — за вобразныя, «мастацкія», аднак абедзве паловы мозга працуюць заўсёды разам: або паслядоўна, або паралельна. Нельга гаварыць, што калі мы думаем, чытаем, то ў нас працуе толькі адно паўшар'е.

Рана трыумфаваць і з нагоды першых поспехаў дзяцей, якія наведваюць школу вуснага лічэння «Сарабан». Ніхто не можа пакуль прадказаць наступствы навучальнай праграмы.

Заўважана, што праўшуны (або праваркія), у якіх правае і левае паўшар'і працуюць паслядоўна, здольныя сваім розумам добра кантраляваць эмоцыі. А вось у амбідэкстраў (яны аднолькава добра валодаюць абедзвюма рукамі) паловы мозга працуюць паралельна, такія людзі нярэдка праяўляюць творчыя здольнасці, арыгінальнасць і самабытнасць. А леўшуны па сваёй арганізацыі знаходзяцца дзесьці пасярэдзіне паміж праўшунамі і амбідэкстрамі.

Памылковым з'яўляецца сцвярджэнне, што ў дзяцей не дамінуе ніводнае паўшар'е. Па-першае, не існуе дамінавання паўшар'яў цалкам, безадносна да канкрэтных функцый. Па-другое, у немаўлят адзначаецца асіметрыя позы, напрыклад, галава ў большасці павернутая ўправа. Калі гэтай асіметрыі няма, то дзіця можа ў далейшым адставаць у разумовым развіцці. Бліжэй да 6-7 гадоў ужо можна казаць, якая рука дамінуе.

Мне здаецца, рана трыумфаваць і з нагоды першых поспехаў дзяцей, якія наведваюць школу вуснага лічэння «Сарабан». Ніхто не можа пакуль прадказаць наступствы навучальнай праграмы, дзе, прынамсі, частка заданняў накіравана на сціранне закладзенай прыродай функцыянальнай асіметрыі паўшар'яў, якая з'яўляецца фундаментальнай уласцівасцю галаўнога мозга здаровых людзей! У артыкуле слушна заўважана, што не ўсе дзеці аднолькава рэагуюць на навучанне па апісанай у артыкуле праграме, многія не прымаюць яе, плачуць, але ж дзіцячы мозг вельмі пластычны і не заўсёды на сваю карысць... Можна меркаваць, што адносна бясшкодна гэта пройдзе, хіба, для амбідэкстраў, якіх сярод людзей менш за трацiну. Ва ўсякім выпадку, перад прыняццем рашэння аб удзеле дзіцяці ў падобных праграмах абавязковым павінна быць тэсціраванне на «рукасць» і асіметрыю іншых функцый. Памятайце, што ісці насуперак прыродзе вельмі небяспечна!

Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Найбольш працаваць секатарам у садзе даводзіцца вясной, але гэта не значыць, што восеньскай абрэзкі не існуе. Яшчэ як існуе.

ВОСЕНЬСКАЯ АБРЭЗКА Ў САДЗЕ: ЯК, ШТО І КАЛІ?

Калі праводзіць

Восеньская абрэзка праводзіцца падчас і пасля лістапада — прыкладна з сярэдзіны кастрычніка. Заканчваць яе варта адначасова са сканчэннем асноўных работ у садзе, гэта значыць, пасля пачатку зацяжных дажджоў. Інакш, утоптваючы цяжкую глебу вакол дрэў і кустоў, вы парушыце яе структуру і ніякай карысці ад абрэзкі не будзе. Калі праводзіць абразанне ў гэты час вельмі трэба — пакладзіце пад ногі драўляныя дошкі або шчыты.

Што тычыцца вінаграду, руж і іншых кустоў, якія ўкрываюцца на зіму, то іх абразанне канчаюць так, каб яго тэрміны не наклаліся на час, калі трэба займацца ўкрыццём. Увогуле, з тэрмінамі заканчэння абрэзкі трэба кіравацца здаровым сэнсам.

Пладовыя дрэвы

Звычайна іх абразаюць вясной, але ўвосень таксама можна папрацаваць секатарам, вызваляючы яблыні, грушы, вішні і слівы ад зацененых і неплоданосных галін, а таксама дробных і слабых — таўшчынёй не больш за 3 см. Калі галіна, якая не плоданосіць, занадта вялікая (звычайная справа), то яе спілоўваюць на шып, пакідаючы вялікі тоўсты пянёк. З ім лепш разабрацца ўжо вясной. Абразаць пладовыя дрэвы можна толькі ў сухое надвор'е з абавязковым замазваннем галінак садовым варам ці пастамі.

Вінаград і іншыя пладовыя ліяны

Іх у асноўным абразаюць менавіта ўвосень, ужо пасля ападання лістоты, бо вясновая абрэзка наносіць раслінам шкоду, з-за якой яны даюць дрэнны ўраджай. Абразаць гэтыя кусты можна рознымі спосабамі, а самы просты, прыдатны для пачаткоўцаў — веерная абрэзка, зручная для фарміравання прыгожай кроны да зімы. Яго ж яшчэ трэба ўкрываць.

Ягадныя кусты накшталт парэчак і агрэсту

Абрэзаць можна і ўвесну, але лепш восенню — шкоды ніякай, а плюс у выглядзе больш спакойнай працы. Абразаць трэба старыя галіны і рэзаць — пад корань. Прасачыце, каб зрэзы былі вышэй магчымага ўзроўню снегу, тады з раслінай зімой усё будзе добра.

У чорных парэчак, як правіла, рэжуць усе галінкі, старэйшыя за 4-5 гадоў, а таксама слабыя і пашкоджаныя парасткі. У чырвоных і белых парэчак трэба абрэзаць сапраўды старыя галіны (9—10 гадоў). У агрэсту — пяць гадоў і старэйшыя, а таксама куст пазбаўляюць ад нулявых парасткаў, якія растуць ад каранёў і блізка да зямлі. Нулявыя лепш рэзаць на чвэрць, так большы шанц, што ад іх адыдуць новыя парасткі. Абразайце галінкі прыкладна на 10 см вышэй здаровай і моцнай пупышкі, каб парасткі раслі вонкі, а не ўглыб куста. Слабыя і кароткія (менш за 7 см) парасткі варта абрэзаць да месца адгалінавання.

Дэкаратыўныя незімаўстойлівыя кусты

Калі каранёвая сістэма кустоў (вейгелы, будлеі і да т.п.) здольная перанесці зіму (у нашым клімаце гэта крыху прасцей), значыць, куст можна абрэзаць на пень і чакаць, што ўвесну ён дасць парасткі.

Маліны — для максімальнай ураджайнасці

Як правіла, маліны абразаюць летам, пасля збору ўраджаю. Але калі вы не паспелі, можна абрэзаць і восенню. Пазбаўляцца трэба ад двухгадовых парасткаў, якія сваё ўжо адпладаносілі і зімой усё роўна адамруць. Акрамя таго, трэба правесці нарміроўку маладых парасткаў малін, якія будуць пладаносіць у наступным сезоне. Пакідаюць прыкладна 40 самых моцных атожылкаў на пагонны метр.

Ружы

Асноўная праца з ружамі ідзе вясной, але і ўвосень ёсць дзе папрацаваць секатарам — трэба пакараціць галіны, якія перашкаджаюць змясціць куст пад сховішча. Заадно трэба выдаліць хворыя лісты, кветкі і плады, а таксама не забыцца апрацаваць парасткі медным купарасам.

Гібрыды відавых руж (белыя, маршчыністыя, зімаўстойлівыя сарты) — абразаць не трэба, бо іх не трэба і хаваць.

Пляцістыя буйнакветкавыя і куставыя ружы ёсць сэнс абрэзаць на траціну. За сезон яны зноў адрастуць.

Чайна-гібрыдныя ружы абразаюць пад укрыццё і выдаляюць лісце. Пачынаць трэба не раней кастрычніка. Потым пазбаўляюцца ад маладых парасткаў, якія не выспелі і ўсё роўна загінуць. У самым канцы восені абразаюць сухія і пашкоджаныя парасткі, а пянькі ад старых галінак рэжуць «на кальцо». Мэтазгодна пазбавіцца і ад парасткаў, старэйшых за пяць гадоў, — калі куст вельмі ўжо разросся.

Гартэнзіі і клематысы

Гартэнзіі на зіму хаваюць, а значыць, загадзя трэба пазбавіцца ад лісця і суквецця, а таксама верхавін парасткаў, якія не адзервянелі (зялёныя на выгляд). Каб не пашкодзіць пупышкі, секатар трэба трымаць строга пад прамым вуглом да парасткаў.

Клематысы I групы абрэзкі (якія цвітуць ранняй вясной) патрабуюць абрэзкі хворых парасткаў і тых, якія загушчаюць куст. Клематысы II групы (якія цвітуць двойчы — вясной і летам) абразаюць на траціну. Клематысы III групы (якія цвітуць з ліпеня і да верасня) можна абрэзаць або цалкам, да 3—5 см над зямлёй, або да 2—4 ніжніх вузлоў.

Іглічныя

Іглічныя добра абрэзаць менавіта ўвосень проста таму, што яны не так пэцкаюцца. Абразаюць звычайна не больш за 1/3 прыросту. Пасля абразання не забудзьцеся ўнесці падкормку і паліць, каб кампенсаваць стрэс. Дарэчы, не забудзьцеся паліваць іглічныя да сярэдзіны лістапада, інакш яны дрэнна перанясуць зіму.

«ЗАКАНСЕРВАВАЦЬ» ГЛАДЫЁЛУСЫ

Тэрміны паспявання клубнецыбулін гладыёлусаў залежаць ад часу цвіцення таго ці іншага сорту. Лічыцца, што спеласць цыбулін наступае праз 30—40 дзён пасля заканчэння цвіцення, аднак пры сухім восеньскім надвор'і выкопваць гладыёлусы пажадана як мага пазней. Гэта робяць пры сухім надвор'і (лепш карыстацца віламі).

У клубнецыбулін абразаюць сцёблы, пакідаючы пянькі каля 1 см, затым чысцяць ад зямлі і кладуць на прасушку ў цёплае сухое памяшканне з добрай цыркуляцыяй паветра. Цыбуліны раскладваюць на роўнай паверхні, у адзін пласт, прасушваюць не менш 3-4 тыдняў. Затым іх яшчэ раз чысцяць ад зямлі, каранёў, адмерлых лускавінак. Пры гэтым аддзяляюць «дзеткі» (іх у адрозненне ад цыбулін чысціць не трэба), самыя буйныя з якіх таксама адбіраюць на захоўванне. Неабходна старанна абследаваць кожную: асобнікі з прыкметамі гнілі, часцей за ўсё ў зоне кораня, выкідваюць. Ачышчаныя цыбуліны прамываюць у цёплай (40—45 °С) вадзе і замочваюць на 15—20 хвілін у вадзе, падфарбаванай крышталямі марганцоўкі, пасля чаго іх дасушваюць пры пакаёвай тэмпературы яшчэ 3—5 дзён.

Захоўваюць апрацаваныя гладыёлусы ў папяровых пакетах з дадатковымі адтулінамі для цыркуляцыі паветра ў халодным сухім памяшканні пры тэмпературы 3—8 °С або ў звычайным халадзільніку пры такой жа тэмпературы.

Для зніжэння рызыкі заражэння грыбковымі інфекцыямі цыбуліны гладыёлусаў можна захоўваць у кантэйнерах з вугальным попелам, але гэтая ўмова не з'яўляецца абавязковай. А вось тэрмін захоўвання цыбулін гладыёлусаў — толькі да наступнай вясны.

СЁННЯ

Месяц

Першая квадра 09.10—15.10. Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Івана*
К. *Вітольда, Максімільяна, Серафіма.*

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 7.32	18.18	10.46
Віцебск	— 7.24	18.06	10.42
Магілёў	— 7.22	18.09	10.47
Гомель	— 7.17	18.07	10.50
Гродна	— 7.47	18.34	10.47
Брэст	— 7.46	18.37	10.51

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Саша, куды вы ходзіце ў грыбы?
— Да суседзяў на балкон.
— Яны іх там вырошчваюць?
— Не, сушаць.

Як казала мая бабуля: самае лепшае практыкаванне для рук — пералічванне грошай! Здымае боль у суставах, нармалізуе ціск, цалкам прыбірае зубны і галаўны боль! Паляпшае зрок, апетыт, гардэроб, вонкавы выгляд і жыллёвыя ўмовы!

— Вовачка, мы з мамай зараз адасобімся ў спальню, а ты пакуль пагуляй і нас не турбуй!
— А марожанае?!
— Якое яшчэ марожанае?
— А вось наш сусед дзядзька Сямён мне заўсёды яго дае, калі да нас прыходзіць!

Малюнак Андрэя СПУЦКАГА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4080.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 11 кастрычніка 2016 года.